# СТАРАЖЫЛ З БАХАНОЎ

**«И пусть ещё ноют военные раны**
**А годы виски серебрят,**
**Но счастливы, рады, горды ветераны,**
**Что кровь проливали не зря»**

Іван Ціханавіч Старасценка лічыцца старажылам вёскі Баханы. За сваё жыццё, а нарадзіўся ён у 1901 годзе, гэгы чалавек пабачыў вельмі многае.

Так склалася, што закончыў усяго толькі чатыры класы царкоўна-прыходскай школы.

— Урокі ў школе пачыналіся з малітвы, — успамінае Іван Ціханавіч. — Вось таму і верую ў Бога і ікону маю, Царква ў Баханах была да вайны, ды немцы спалілі.

Памятае старажыл і Кастрычніцкую рэвалюцыю 1917 года.

У трыццатыя гады пачалі калгасы ўтварацца ў рэспубліцы.

— Жыла наша сям'я аднаасобна. Трымалі каня, карову, свіней, зямля была, — працягвае Іван Ціханавіч. — Вырашылі ўступіць у калгас і не шкадую, што так зрабіў.

Разам з жонкай Уллянай Якімаўнай працаваў у калгасе. Спачатку калгаснікам, а потым прызначылі брыгадзірам палявадчай брыгады,

— Перад пачаткам вайны з Германіяй наш калгас ужо, як гаворыцца, «моцна стаў на ногі». І хоць мала было трактараў, а ў асноўным працавалі на конях, мы з радасцю ішлі на працу. Бывала, жнуць жанчыны збожжа сярпамі спяваюць, ды так прыгожа! А з працы вярталіся змораныя, але ж зноў з песнямі, — расказвае І. Ц. Старасценка. — І грошай атрымлівалі мізэр, таму што на працадні рабілі. Канчатковая аплата залежыла ад колькасці выхадаў. А весела як было на вёсцы! Не тое, што зараз: кожны сядзіць у сваёй хаце, утуліўшыся ў тэлевізар.

Усё б быдо добра, калі б не нядзельная раніца 22 чэрвеня 1941 года, калі ў іх дом уварвалася страшэннае ледзяняшчае душу слова: «Вайна!».

У першых чыслах ліпеня яго прызываюць у іармію. Дома засталася жонка з двума сынамі. Разам з аднавяскоўцамі прыбыў у г. Ялец. Там фарміраваліся часці для адпраўкі на фронт. Папаў служыць у пяхоту. Першыя баі для яго былі на Арлоўшчыне. Дзяліць не прыходзілася: усе былі цяжкія, кровапралітныя, прыносячыя раненні, калецтвы, а вельмі часта і смерць.

А потым было акружэнне і палон. На цягніку спачатку прывезлі ў Гомель. Рыхтавалі да адпраўкі далей, у Бабруйск.

— Нядоўга я быў у палоне: усяго 12 дзён, — усміхнуўся былы салдат. — Не мог з гэтым змірыцца. Вырашыў уцячы. Зваў і таварышаў, але яны адмовіліся, вось адзін і ўцёк прама з рухаючагася цягніка...

Пешшу, абыходзячы вялікія дарогі, гарады, вёскі, дабраўся Іван Ціханавіч да Бахаваў. Так і жыў там, пакуль у верасні 1943 года не прыйшло вызваленне. Затым усіх мужчын і юнакоў прызыўнога ўзросту прыгналі ў армію.

Зноў фронт: рака Проня. Вельмі многа тут загінула людзей. Іван Ціханавіч у баях на гэтай рэчцы атрымаў лёгкае раненне ў руку. Яго накіравалі ў г. Клімавічы ў шпіталь. Лячыўся месяц, а затым трапіў на 2-гі Беларускі франт. Прымаў удзел у вызваленні гарадоў Крычаў, Чэрыкаў.

Пры фарсіраванні невялікай, але глыбокай рэчкі Рэста, што на Магілёўшчыне, Іван Ціханаівіч праявіў гераізм. Адным з першых ён пераправіўся цераз яе і завязаў бой у акопах: з немцамі, а потым падаспелі на дапамогу таварышы. За гэты бой ён атрымаў ордэн Славы III ступені.

А ў хуткім часе яшчэ адна ўзнагарода — медаль «За адвагу» з’явілася на гімнасцёрцы нашага земляка. Камандаванне дала загад правесці разведку боем.

— Нас было ўсяго 18 чалавек, — расказвае І. Ц. Старасценка. —Уварваліся ў нямецкія акопы, каго прыкончылі прама на месцы, хто змог, той уцёк, а аднаго фашыста «языка» даставілі ў сваю часць. Праўда, і ў нас не абыйшлося без страт: трое хлопцаў загінулі.

З баямі прайшоў Беларусь, Польшчу. Дайшоў да Германіі. Вайна для яго закончылася на р. Одэр. Вярнуўся дамоў, у Бахань. Прымаў удзел у аднаўленні разбуранай гаспадаркі. Цяжка было на першых парах. То аднаго не хапала, то другога. Але ж выстаялі! Доўгі час рабіў у калгасе кладаўшчыкам, а потым вартаўніком на ферме. Да баявых узнагарод прыбавілася шмат юбілейных, а сярод іх ордэн Айчыннай вайны II ступені.

Дзесяць гадоў назад памерла яго жонка. Цяпер у хаце жыве адзін.

Сыны Міхаіл Іванавіч і Васіль Іванавіч жывуць у гэтай жа вёсцы. Міхаіл Іванавіч ужо на заслужаным адпачынку, працаваў у «Чырвоным маяку» інжынерам, а Васіль Іванавіч зараз робіць на калгаснай запраўцы, раней быў каімбайнерам. Дапамагаюць нарыхтаваць састарэламу бацьку дроў, робяць і іншыя работы.

— Раней я вельмі любіў чытаць кнігі, газет і часопісаў шма выпісваў. Зараз бачу дрэнна, стары стаў. А тут яшчэ не працуе радыё — тлумачыць Іван Ціханавіч, — а як жа без навін? Зараз такое ў свеце творыцца! Страшна за моладзь, мы ж сваё аджылі...

Не пакідаюць без увагі Івана Ціханавіча аднавяскоўцы. Часта звяртаюцца да яго і за дапамогаў, валодае гэты дзіўны, свавалосы чалавек сакрэтамі нетрадыцыйнага метаду лячэння.

**Н. Кацяшова.**

**Кацяшова, Н. Старажыл з Баханоў** / Н. Кацяшова // Шлях Кастрычніка. — 1993. — 4 верасня. — С. 2.

*Іван Ціханавіч Старасценка, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, старажыл вёскі Баханы.*